23 ЛЮТАГА—57 ГОД САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ



Малюнак В. РОШЧЫНА.

57-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту савецкія людзі адзначаюць напярэдадні 30-годдзя Вялікай Перамогі над фашызмам. Многа год мінула з таго часу, як над зрынутым рэйхстагам узвіўся пераможны чырвоны сцяг. У смяротнай схватцы з найбольш рэакцыйнымі і агрэсіўнымі сіламі імперыялізму савецкі народ не толькі адстаяў гонар, свабоду і незалежнасць сваёй сацыялістычнай Радзімы, але і выратаваў сусветную цывілізацыю ад пагрозы карычневай чумы.

Перамога над самым лютым ворагам чалавецтва—германскім фашызмам, у дасягненне якой наш народ і яго доблесныя Узброеныя Сілы унеслі рашаючы уклад, мела сусветна-гістарычнае значэнне. Яна адкрыла многім народам шлях да свабоды, незалежнасці, сацыяльнага прагрэсу, прывяла да карэнных змен у суадносінах класавых сіл на міжнароднай арэне у карысць міру, дэмакратыі і сацыялізму. І калі зараз пазіцыі сацыялізму больш трывалыя, чым калі-небудзь, а справа міру атрымлівае усё новыя і новыя поспехі, то гэтым народы нашай планеты у вялікай меры абавязаны перамозе Савецкага Саюза у Вялікай Айчыннай вайне.

Здзяйсняючы свой бессмяротны подзвіг, наш народ абаперауся на непераадольную сілу новага грамадскага ладу — сацыялізм. Вялікім правадыром, арганізатарам савецкага народа у гэтай вайне была наша слаўная Камуністычная партыя. Увесь свой арганізатарскі геній, усю сілу магутнай садружнасці народаў СССР, усю накопленую гадамі народную энергію, цвёрдасць, выносівасць і магутную волю наша партыя накіравала да адной мэты—на разгром фашызму.

Матэрыялы, прысвечаныя Дню Савецкай Арміі, чытайце на 2-й і 3-й стар.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 6 (1080) ● Чацвер, 20 лютага, 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

ПЛЁН ТВОРЧЫХ ПОШУКАЎ

У мінулым годзе у нашым універсітэце навукова - даследчай работай займалася 7.058 студэнтаў. На усіх факультэтах, на кафедрах, у НДІ ПФП, вылічальным цэнтры і пры навукова-даследчых лабараторыях паспяхова працуюць 158 навуковых гурткоў і семінараў, 7 студэнцкіх навукова - даследчых лабараторый (СНДЛ) і вылічальных цэнтраў (СВЦ), даследчыя студэнцкія групы. Акрамя гэтага, вялікая частка студэнтаў удзельнічае у выкананні дзяржбюджэтных і гаспадарча-дагаворных работ, у вучэбна - навуковых экспедыцыях.

Паспяхова працавалі студэнцкія навукова - даследчыя лабараторыі радыёфізікі і электронікі ЗВЧ, метралогіі прыродных сістэм і інш.

Шырокае развіццё у апошнія гады атрымала такая форма навукова - даследчай работы студэнтаў, як удзел у выкананні гаспадарчых дагавораў для заводаў, прадпрыемстваў, НДІ і розных арганізацый. Так, у 1974 годзе студэнты БДУ прымалі непасрэдны удзел у выкананні усіх дагавораў, якія былі заключаны кафедрамі, лабараторыямі і навукова-даследчым інстытутам прыкладных фізічных праблем (НДІ ПФП). 576 студэнтаў фізічнага, хімічнага, геаграфічнага, біялагічнага, гістарычнага, юрыдычнага факультэтаў і факультэта прыкладной матэматыкі асвоілі каля 500 тысяч рублёў. Па матэрыялах даследаванняў, праведзеных у адпаведнасці з тэмамі дагавораў, студэнтамі апублікаваны ці падрыхтаваны да друку 47 навуковых артыкулаў. Вынікам выканання гаспадарчага дагавору кафедрай электрафізікі з'явілася стварэнне пауправаднікоўага квантавага генератара ПКГ-1, які быў экспанатам на ВДНГ СССР у 1974 годзе. Аутары работы, у тым ліку і студэнт V курса фізфака Н. Калiва, узнагароджаны сярэбраным медалём выстаўкі.

Самы актыўны удзел прымаюць студэнты у навуковых канферэнцыях. У мінулым годзе было праведзена 4 агульнаўніверсітэцкія канферэнцыі: XXXI студэнцкая канферэнцыя, канферэнцыя, прысвечаная 30-годдзю Польскай Народнай Рэспублікі, і канферэнцыя, прысвечаная 25-годдзю Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, а таксама савецка-балгарская, прысвечаная 30-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі. Усяго на універсітэцкіх навуковых канферэнцыях заслухана і абмеркавана 1.135 дакладаў, аутарамі якіх былі 1.620 студэнтаў усіх факультэтаў дзённага, вячэрняга і завочнага навучання. З дакладамі выступілі таксама студэнты і аспіранты з НРБ, ПНР і ГДР.

Самай масавай была XXXI студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 104-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. На ёй было заслухана 893 даклады, падрыхтаваныя 1.153 студэнтамі. Найбольш цікава і арганізавана праходзілі пасяджэнні секцый на гістарычным, фізічным, філалагічным факультэтах і факультэце прыкладной матэматыкі. У секцыйных пасяджэннях удзельнічалі госці — 28 студэнтаў з 17 ВНУ Савецкага Саюза.

Члены студэнцкага навуковага таварыства БДУ прынялі актыўны удзел ва усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Больш за 1.000 маладых даследчыкаў спаборнічалі у 11 прадметных алімпіядах.

Значны поспех прынёс II, рэспубліканскі тур алімпіяды: дыпломамі і грашовымі прэміямі былі ўзнагароджаны 29 студэнтаў БДУ, а у каманды для ўдзелу у заключным, III туры усесаюзнай алімпіяды, увайшло 10 нашых прадстаўнікоў.

Правядзенне прадметных алімпіяд і конкурсаў па спецыяльнасцях паказала узросшую

[Заканчэнне на 4-й стар.].

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

На чарговым семінары камсоргаў універсітэта абмяркоўваліся пытанні абмену камсамольскіх дакументаў, а таксама падрыхтоўка да стварэння на факультэтах студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Планы і рэкамендацыі давёў да ведама камсоргаў сакратар камітэта камсамола БДУ У. А. Навумовіч.

У новым нумары «Журналіста» — насцengазеты журфака — абвешчан конкурс на лепшы нарыс, замалёўку, артыкул, фотаінфармацыю, у якіх цікава і захапляюча было б расказана аб жыцці факультэта.

ДТСААФ БДУ арганізаваў прагляд кінафільмаў, прысвечаны 57-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Студэнты ўжо убачылі кінастужку «Жалезны паток». Наступны фільм — «Радавы Аляксандр Матросаў».

Напярэдадні Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту студэнты гістфака сустрэліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Перад трэцякурснікамі — гісторыкамі, філосафамі, палітэканомамі — выступілі Герой Савецкага Саюза, прафесар кафедры гісторыі КПСС БДУ Д. П. Жмуроўскі, супрацоўнік палітупраўлення ЧБВА падпалкоўнік А. С. Харзбін, выкладчык кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў В. А. Ожагаў, старшыня савета ветэранаў БДУ М. І. Аносаў.

Набраў тэмп другі семестр.

НА ЗДЫМКУ: лекцыю па курсу «Вылічальныя машыны» чытае студэнтам IV курса фізфака Элеанора Васільеўна Кеда.

Фота С. Дзеянкова.

НЕПЕРАМОЖНАЯ І ЛЕГЕНДАРНАЯ

● З успамінамі аб баях за вызваленне Беларусі выступае перад студэнтамі БДУ ветэран Вялікай Айчыннай вайны, генерал-маёр інжынерных войск у адстаўцы Мікалай Іванавіч Аляксееў.

● Дауняя і моцная дружба звязвае студэнтаў з воінамі ЧБВА, якія часта бываюць гасцямі універсітэта. Яны не толькі расказваюць сябрам-студэнтам аб сваіх справах, аб поспехах у баявой і палітычнай падрыхтоўцы, але і выступаюць з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

Фота М. Нечыпарэнкі.

ХВАЛЮЮЧЫЯ СУСТРЭЧЫ

Як мы ўжо паведамлялі, дэлегацыя нашага універсітэта пабывала у Днепрапятроўску у час ударнага працоунага тыдня, прысвечанага гораду-герою Мінску.

Расказаць аб гэтай паездцы мы папрасілі аднаго з членаў дэлегацыі кандыдата гістарычных навук І. В. МАРЧАНКУ.

У Днепрапятроўску, горадзе слауных рэвалюцыйных, баявых і працоуных традыцый па ініцыятыве рабочых ордэна Леніна завода імя Г. І. Пятроускага праводзіцца 30-тыднёвая працоуная вахта, прысвечаная 30-годдзю бессмяротнага подзвігу савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне. У дні ударных тыдняў стала добрай традыцыяй запрашаць у горад дэлегацыі з іншых саюзных рэспублік, шырока адлюстроўваць у друку дасягненні працаунікоу гораду-герояу.

З вялікай удзячнасцю працоуныя Днепрапятроўска сустрэлі прывітанне Мінскага гарадскога камітэта КПБ і выканкома гарадскога Савета дэпутатаў працоуных, накіраваныя ім у сувязі з правядзеннем працоунага тыдня, прысвечанага гораду-герою Мінску. Працоуным дасягненням мінчан быу прысвечан артыкул першага сакратара Мінскага гаркома КПБ У. А. Ляпёшкіна, апублікаваны 28 студзеня г. г. у газеце «Днепр вячэрні».

27 студзеня, у першы дзень працоунай вахты, прысвечанай гораду-герою Мінску, днепрапятроуцы цёпла віталі пасланцоу сталіцы Савецкай Беларусі, якія прыбылі па запрашэнню калектыву Днепрапятроускага дзяржаунага універсітэта імя 300-годдзя уз'яднання Украіны з Расіяй. У саставе дэлегацыі былі выкладчыкі БДУ прафесар А. А. Галаушко, дацэнты У. А. Навіцкі, І. І. Семяжонау і аутар гэтых радкоу.

Першая сустрэча з партыйнымі і савецкімі работнікамі, прадстаунікамі друку, радыё і тэлебачання адбылася у Жоутневым райкоме Кампартыі Украіны. Першы сакратар райкома В. І. Конеу расказау пра горад Днепрапятроуск, пра 30-тыднёвую працоуную вахту днепрапятроуцаў у гонар 30-годдзя вялікай Перамогі, аб дасягненнях працоуных Жоутневага раёна у вызначальным годзе дзевятай пяцігодкі. Аб поспехах сваіх калектываў, іх сувязях з брацкай Беларуссю гаварылі сакратар парткома абуткоунага аб'яднання В. В. Каплі і намеснік сакратара парткома Днепрапятроускага універсітэта І. Г. Хмельнікау.

А затым члены дэлегацыі горада-героя Мінска сардэчна падзякавалі днепрапятроуцам за запрашэнне і расказалі аб рэвалюцыйных традыцыях, баявых подзвігах і працоуных здзяйсненнях мінчан, дасягненнях творчай інтэлігенцыі сталіцы БССР.

У гэты ж дзень у Палацы студэнтаў імя Ю. Гагарына адбылася сустрэча са студэнтамі і выкладчыкамі Днепрапятроускага універсітэта на тэматычным вечары «Мінск — у страі ратным, Мінск — у страі працоуным». Удзельнікі сустрэчы з вялікай увагай паглядзелі фільм «Горад-герой Мінск».

У наступныя дні наша дэлегацыя сустракалася з выкладчыкамі і студэнтамі хіміка - тэхналагічнага, інжынерна - будаунічага і медыцынскага інстытутаў, з вучнямі і настаунікамі сярэдняй школы № 100 і іншымі калектывамі. Адбыліся сустрэчы з рабочымі, інжынерна-тэхнічнымі работнікамі і служачымі Днепрапятроускага вытворчага аб'яднання абутковых прадпрыемстваў і многатысячным калектывам прэсавага завода. Мы бачылі, з якім энтузіязмам і энергіяй працуюць у завяршальным годзе дзевятай пяцігодкі днепрапятроуцы, як яны свята берагуць і памнажаюць слауныя рэвалюцыйныя і працоуныя традыцыі роднага горада.

З вялікай цікавасцю мы знаёміліся з перадавікамі вытворчасці: ветэранамі працы і маладымі рабочымі, сустракаліся з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, якія нясуць працоуную вахту, радаваліся іх поспехам у працы, успаміналі цяжкія гады суровых выпрабаванняу Вялікай Айчыннай вайны, вывучалі вопыт ваенна-патрыятычнага выхавання у ВНУ і школах.

Усюды, дзе мы былі, нас сустракалі моцнымі рабочымі поціскамі рук, шчырай гасціннасцю і кветкамі. Гэта былі хвалюючыя сустрэчы. Цяжка перадаць словамі глыбіню брацкіх пачуццяу, сардэчнасць. Такая дружба гарадоу і працоуных калектываў можа быць толькі у сацыялістычнай краіне!

У заводскіх цэхах, на будаунічых пляцоуках, у аудыторыях ВНУ і у школах днепрапятроуцы самаадданай працай памнажаюць добрую славу свайго горада, якому у 1976 годзе споуніцца 200 год. Як і у гады барацьбы за уладу Саветаў, за індустрыялізацыю краіны, у суровы час выпрабаванняу Вялікай Айчыннай вайны, так і цяпер, у перыяд мірнага камуністычнага будауніцтва, працоныя Днепрапятроуска ідуць у адзіным, дружным страі з усімі народамі нашай краіны.

І. МАРЧАНКА,
кандыдат гістарычных навук.

ЯК ВАМ СЛУЖЫЦЦА?

У мінулым годзе для іх празвінеу у апошні раз званок з лекцыі. А зараз пядаюцца выпускнікі БДУ—афіцэры.

«Як вам служыцца?» — з такім пытаннем звярнулася да некаторых выпускнікоу гістарычнага факультэта рэдкалегія газеты «Доуг», органа ДТСААФ гістфака.

Н. Сянкевіч. Спачатку было даволі цяжка — шмат работы і новых клопатау. Нельга сказаць, што цяпер лёгка, але я навучыуся рацыянальна выкарыстоўваць час, ды і вопыт пейкі з'явіуся. Тут я асабліва ацаніу важнасць вучэбных ваенных зборау, на якіх мы былі пасля чацвёртага курса. Чым больш дысцыплінаваным, уважлівым будзеш на зборах, тым больш хутка і урэзупена уцягнешся у пялёгкую службу афіцэра.

А. Пазняк. У мінулым леніпскі стыпендыят. Быць афіцэрам Узброеных Сіл нашай краіны— пачэсна. На нас жа, выпускніках гістарычнага факультэта нашага універсітэта, ляжыць двайны абавязак — падтрымліваць гонар не толькі афіцэра, але і гісторыка, выпускніка БДУ.

Мая служба вельмі неспакойная, і я павінен сказаць, што вялікую дапамогу мне аказала вучоба у БДУ, а таксама фізічная падрыхтоука, перш за усё лёгкаатлетычная, якую я атрымау у час вучобы ва універсітэце

В. Мельнікаў. Я таксама хачу сказаць добрае слова аб ваенна-вучэбных зборах. Вопыт штабной работы, які я атрымау там, цяжка пераацаніць зараз для маёй службы. Вельмі спатрэбілася і фізічная падрыхтоука. Бо афіцэр павінен быць прыкладам для падначалепых ва усіх адносінах.

Дададзім, што В. Мельнікаў нядауна стаў чэмпіёнам сваёй часці па лёгкаатлетычнаму кросу. Барцы А. Літвін і М. Рудакоускі, сённяшнія афіцэры, і зараз захоуваюць высокую спартыуную форму.

Многія афіцэры, выпускнікі нашага факультэта, вядуць вялікую камсамольскую работу.

АДДЗЯЛЕННЕ, К БОЮ!

Ваенная вывучка неабходна кожнаму з нас. Бо па загаду Радзімы, па загаду сэрца кожны стане на абарону Айчыны. А каб перамагчы любога ворага, неабходны сучасныя ваенныя веды і уменне арыентавацца у самым складаным становішчы.

— Аддзяленне, к бою! — чуецца каманда падпалкоуніка Р. І. Пекі, і трэцяе аддзяленне на чале з камандзірам Асіпёнкам займае выгадны, з ваеннага пункту гледжання, агнявы рубеж.— Не даць «праціўніку» заняць узлесак! Прыцэльны агонь весці бесперапынна!..

Гучаць выстралы, дзесьці чуюцца крыкі «ура!» — гэта другое аддзяленне перайшло у «атаку»...

Так ідуць вучэбныя заняткі па ваеннай падрыхтоўцы у гісторыкаў і філолагаў.

М. ДЗЕСЯТНІК.

НА ЗДЫМКУ: аддзяленне на агнявым рубяжы.

АКОПНЫ

Наступіць час, і гэты невялікі, любоуна афармлены рукапісны часопіс знойдзе сабе месца пад шклом у музеі Айчыннай вайны.

Яго старонкі многае раскажуць аб тым, як доблесна і самаахвярна ваявалі нашы людзі, якім цяжкім, доугім і слауным шляхам ішлі яны да перамогі над іншаземнымі варварамі.

«Чырвоны сапёр» — так называецца гэты часопіс. Над яго загалоукам — «Смерць нямецкім захопнікам!» Пад ім — «Акопны часопіс асобага гвардзейскага сапёрнага батальёна». Рэдактары, аутары, мастакі ствараюць гэты часопіс у перарывах паміж баямі.

Абарона Сталінграда. Сапёры, не ведаючы адпачынку ні днём, ні ноччу, умацоувалі пярэдні край. Батальён уклау сотні тысяч процітанкавых і проціпяхотных мін. Калі пачалося наша наступленне, яны гэтак жа умела, цярпліва, бясстрашна рабілі праходы у абароне ворагау, размініравалі мінныя палі. Менавіта у разгар наступальных баёу, калі людзі не ведалі ні сну, ні спакою, нарадзіуся часопіс «Чырвоны сапёр». Ён са сваімі артыкуламі, вершамі, малюнкамі, частушкамі аказауся патрэбным, жыццёвым і трывала увайшоу у быт гэтага невялікага сапёрнага калектыву, які прарабіу такі цяжкі і незабыуны шлях па дарогах вайны.

За баі пад Сталінградам батальён атрымау званне гвардзейскага. Часопіс расказвае аб наступных буйных этапах гісторыі батальёна.

ПАМЯТНЫ ДЗЕНЬ

ВЫКОНВАЮЧЫ ЗАГАД

ЛІСТАПАД 1943 года. Фарсіраваўшы Днепр у раёне горада Лоева, наша гвардзейская кавалерыйская дывізія з баямі наступала у напрамку станцыі Бабічы, на участку чыгункі Гомель — Калінкавічы.

У адзін з дзён, к вечару, пасля кароткай, але жорсткай схваткі, наш полк увараваўся у Бабічы, якія палалі факелам.

На другі дзень камандзір палка гвардыі палкоўнік Сысоеў сабрау камандзіраў эскадронаў і паznаёміу іх са становішчам: у напрамку Васілевіч наступаць немагчыма, бо на дарогах праціўнік стварыу магутную абарону. Іншых шляхоу з-за непраходных балот няма. Выхад быу адзін: часткай сіл скрыта пранікнуць у глыб абароны праціўніка, узарваць трываласць яе знутры і стварыць умовы, якія забяспечаць палку магчымасць паспяховага наступлення на захад. Загад выканаць гэту задачу быу аддадзен камандзіру нашага эскадрона, гвардыі капітану Майструкову.

З наступленнем цемнаты у суправаджэнні правадніка, мясцовага жыхара, эскадрон у складзе 85 чалавек выступіу з Бабіч. Пад праліуным дажджом, у неглыгляднай цемры, па балотах праваднік вывеу эскадрон скрытна за пярэдні край праціуніка да дарогі, якая ішла уздоуж чыгункі.

Пры падыходзе да моста праз раку Ведрыч з супрацьлеглага боку эскадрон абстралялі.

Спешыліся і накіраваліся далей. І раптам з боку чыгуначнага раз'езда пачулі: «Хальт!», а затым праціунік адкрыу шквальны агонь з усіх відаў зброі. Мы разгарнуліся у баявы парадак і акапаліся.

Літаральна у лічаныя мінуты гітлерауцы нас акружылі. Злева, уздоуж чыгуначнага насыпу, разгарнуліся каля 30 варожых аутаматчыкаў і адкрылі агонь, а у тыл эскадрону зайшлі два бронетранспарцёры з агнямётамі і аутаматчыкамі. Справа ад нас было топкае балота. Эскадрон аказауся зацісnутым на невялікім пятачку. Завязауся няроуны бой. Нас выратавала цемра і тое, што праціунік не ведау, як нас мала.

Да світання старшына эскадрона гвардыі старшына Бірукоу сабрау канаводау і з імі разбіу праціуніка у тыле, знішчыушы аутаматчыкаў і бронетранспарцёры, а гвардыі лейтэнант Вергуноу са сваім узводам адбіу атаку аутаматчыкаў, якія наступалі злева, з-за чыгункі. Да світання праціунік застауся толькі перад фронтам эскадрона, але наша становішча ад гэтага не палепшылася. Толькі цяпер стала ясна, які жорсткі будзе бой.

Вакол доміка, што на раз'ездзе, — двухметровая дрэва-земляная сцяна з амбразурамі і кулямётамі у іх. Частакол, дротавыя перашкоды і мінныя палі вакол гэтага умацавання. Па абодва бакі ад чыгункі дзве зенітныя гарматы для стральбы па наземных цэлях. Ад раз'езда направа да балота і налева да лесу — траншэі, адкуль праціунік вёу інтэнсіуны агонь з кулямётау, гармат і іншых відаў агнястрэльнай зброі. З глыбіні па эскадрону вялі беглы агонь мінамёты.

Гвардыі капітан Майструкоу прыняу рашэнне: няглядзячы на няроуныя сілы, выканаць задачу. На працягу сутак эскадрон вёу няроуны бой.

На другія суткі, прарваушы абарону на пярэднім краі, на дапамогу эскадрону падышоу наш полк. Праціунік увёу у бой свой браняпоезд, які курсіраваў паміж Васілевічамі і раз'ездам, але артылерысты палка трапнымі выстраламі прымусілі яго замерці на месцы.

К канцу другіх сутак падышлі наша і суседняя стралковая дывізіі. А на наступны дзень праціунік быу разгромлен і раз'езд узят.

Перад нашымі вачыма паустала неверагодная карціна. У траншэях і умацаваннях праціуніка была вялікая колькасць кулямётау, мінамётау, зенітных гармат і іншай зброі. На тэрыторыі узвышаліся штабелі забітых фашыстау.

За выкананне пастауленай задачы гвардыі капітану Майструкову пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

В. МІЧКОЎ,
старшы выкладчык ваеннай кафедры, падпалкоунік.

МАЛАДОСЦЬ ПАРТЫЗАНСКАЯ

Яны сабраліся разам праз многа год пасля апошняй сустрэчы — мінулым летам на свяце 30-годдзя вызвалення рэспублікі.

Перад адпрауленнем да месца збору былых партызанскіх атрадау 1-й Мінскай брыгады Марыя Лукінічна Бачыла увайшла у аутобус, на якім напісана была назва роднага атрада, убачыла пабялеушыя скроні і амаль незнаёмыя тварыты х, што засталіся у яе памяці зусім маладымі, —сяброу юнацтва, сяброу па зброі. Ды і яны усе у постаці сталай жанчыны не адразу пазналі тую маладзенькую тоненькую дзяучыну-сувязную.

— Маша, наша Маша прыехала! — ускліквала былая партызанка, бегучы да іх групы.

«Наша Маша» — так звалі Марыю Лукінічну у атрадзе.

...У першыя дні акупацыі, калі яна прабіралася з Мінска, дзе працавала да вайны, у Рудзенскі раён да бацькоу, давялося праходзіць праз вёску Новы Двор. Тое, што убачыла тут дзяучына, вельмі уразіла яе: сагнуушыся, ішоу за плугам старэнькі дзядок— араты, а над ім з хлыстом у руках стаяу фашыст і усё падганяу і падганяу знясіленага старога...

А дома чакала страшная вестка: забралі бацьку, былога намесніка старшыні калгаса.

Уласная гора, здзекі і забойствы прыгняталі, знясільвалі, але, нягледзячы ні на што, жыла думка, што не могуць савецкія людзі пакінуць усе гэтыя зверствы беспакаранымі. Павінны ж дзесьці быць партызаны!

Пачала шукаць. Хадзіла па вёсках, распытвала у надзейных людзей. Нарэшце, сустрэла партызанскіх сувязных, прапанавала свае паслугі і праз дзён колькі атрымала першае заданне: схадзіць у Мінск, паспрабаваць дастаць вату, бінты, медыкаменты.

Мінск здавауся зусім апусцелым, але знайшла сваіх старых знаёмых, зайшла да кватэрнай гаспадыні, у якой сваячка працавала у бальніцы, і заданне было выканана.

Потым даведвалася, ці ёсць немцы у бліжэйшых вёсках, разведвала сілы ворага у населеных пунктах, даставала медыкаменты, бінты, соль. Ад аднаго з супрацоунікаў мясцовай паліцэйскай управы рэгулярна даведвалася, якім чарнілам ставяцца пячаткі на пашпартах і пропусках. Колер гэтага чарніла час ад часу мяняуся, і партызанам важна было пра гэта ведаць.

Марыя Лукінічна многа расказвае аб сваёй рабоце, аб днях барацьбы, аб атрадных справах.

Ёй удалося паведаміць вязням з Трасцянца, якіх вазілі з лагера на працу, на якім кіламетры магілёускай шашы будзе чакаць партызанская засада. І такім чынам удалося арганізаваць пабег.

Аднойчы у Рудзенску у час нарады мясцовых паліцаяу, калі іх увага была адцягнута, атрадная сувязная здабыла для сяброу-партызан танія заусёды неабходныя патроны.

Яна перапрауляла сваіх людзей у атрад, калі тым пагражала выкрыццё, яна ведала, як абысці варожы пост, як пранесці схаваныя у кошыку патроны.

Два разы яна амаль цудам пазбегла аблаu. Першы — калі расстрэльвалі сем'і партызан і камуністаu, сусед-паліцай доуга круціу у руках пашпарт дзяучыны і усё ж вярнуу: «Ладна, пажыві яшчэ крыху...». Другі раз выпусціу вартаунік-чэх...

А яе ужо ведалі і лавілі. Давялося хавацца у суседзяу, уцякаць з роднай хаты у штабелі торфу, які быу складзен для прасушкі. Прыходзілася адседжвацца у рэчцы, дыхаючы праз трубачку з чароту.

Нарэшце, быу атрыман загад камандзіра — не пакідаць месца размяшчэння атрада. І давялося дзяучыне займацца рознымі справамі: выпякаць хлеб і стаяць на пасту, выконваць гаспадарчыя даручэнні. Прыйшлося і зброю браць у рукі, калі атрад выходзіу з акружэння.

З таго часу прайшло шмат гадоу. Марыя Лукінічна Бачыла працуе на завочным факультэце БДУ. Усе пакаленні студэнтау-зазочнікаu юрыдычнага і геаграфічнага факультэтаu прайшлі, як кажуць, праз яе рукі. Марыя Лукінічна нярэдка выступае з успамінамі перад вучнямі школ горада. А вось зараз яе, разам з іншымі былымі партызанамі, запрашаюць прыехаць у школу, дзе юныя следапыты стварылі музей партызанскай славы.

А дома у Марыі Лукінічны часта па вечарах бабуляй завалодвае шасцігадовы унук, патрабуе усё новых і новых расказаu аб партызанскім жыцці і узрушана здзіуляецца:

— Няужо і ты, бабуля, ваявала?

Т. САХАШЧЫК.

Беларускі Дзяржауны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — самы папулярны з мінскіх музеяу. Сюды ідуць сівагаловыя удзельнікі былых баеu і тыя, чыё дзяцінства апякли ваенныя вятры, сюды прыходзіць моладзь схіліць галовы перад подзвігам дзядоu і бацькоu, сюды прыводзяць сваіх дзяцей, каб навучыць іх цаніць мір і свабоду. тыя, што ужо і самі не ведалі вайны. Удзячная памяць людская.

Вялікія пакоі скрадваюць гукі крокаu і слоu. Толькі вочы наведвальнікаu — красамоуныя сведкі іх душэунага стану. Тут кельга быць раунадушным. Тут сама гісторыя услауляе і аовінавачвае, вучыць кожнага заусёды быць пільным.

- *Равесніцы.*
- *Маці.*
- *Экспанаты—сведкі.*

Фота Т. АБРАМОВІЧ.

ЧАСОПІС

Лета 1943 года. Удзел у прарыве умацаванай лініі праціуніка. «Цудоуна працавалі лодкі, — расказвае часопіс аб фарсіраванні ракі Акі, — бясшумна, у кароткі тэрмін быу наведзен штурмавы мосцік даужынёй у 50 метраu... У гэты час сапёры, якія увахадзілі у групы разгароджвання, паузлі і да радоу калючага дроту. Са шчупамі, ножніцамі, мінашукальнікамі, не звяртаючы увагі на агонь праціуніка, упарта рухаліся наперад гэтыя маленькія атрады. Для падрыву калючага дроту сапёры неслі, як у нас гавораць, «смерць падпахай» — магутныя, падоужаныя зарады толу».

26 верасня батальён падышоу да Дняпра, і назаўтра на лодках, плытах, рыбацкіх чаунах перапрауляу ён палкі на правы бераг.

Зараз сапёры працягваюць бой. «Мы рухаемся, — піша часопіс, — уперад, на захад. Наперадзе яшчэ сур - ёзныя баі з ворагам, але мы упэунены у нашай перамозе і прыкладаем усе сілы, не шкадуем жыцця для яе паскарэння».

Многія героі аддалі сваё жыццё у баях, многія здзейснілі цудоуныя подзвігі. І «Чырвоны сапёр» свята беражэ памяць пра іх. Кожны баявы этап у гісторыі батальёна звязан з канкрэтнымі імёнамі.

Сталінград. Трэба было размініраваць мінnае поле перад пярэднім краем праціуніка. Быу страшэнны холад. Чэкі на мінах замерзлі і не паддаваліся сапёрам. Тады гвардыі сержант Галаванаu і гвардыі радавы Дзянісаu у мароз і мяцеліцу дыханнем адагравалі чэкі і адну за другой абясшкоджвалі нямецкія міны.

Ака. Сапёры прарабілі праходы у складанай сістэме варожых загараджэнняu. У адной з груп былі паранены усе байцы. Уцалеu толькі сапёр Буркоу. Застаушыся адзін, ён пад моцным агнём ворага, кожную мінуту рызыкуючы жыццём, расчысціу шлях пяходе.

Днепр. Гвардыі радавы Сімановіч, да вайны студэнт, у цёмную асеннюю ноч, якую перарэзалі ракеты і трасіруючыя чэргі варожых кулямётаu, пад грукат разрываu першым з дэсантам пяхоты дасягнуу берага ракі Днепр.

Апошнія нумары часопіса запоўнены галоуным чынам матэрыяламі аб Дняпры. «Чырвоны сапёр» расказвае аб воінах, якія вызначыліся пры пераадоленні складанейшай і буйнейшай воднай перашкоды, — гвардыі яфрэйтару Сяргею Рачкову, гвардыі лейтэнанце Васілію Шалаеву, гвардыі сержанце Мікалаю Астраушку і іншых. Артыкул гвардыі капітана Напрэева «Фарсіраванне Дняпра» малюе карціну геройскай пераправы нашых войск. Перад вачыма чытачоу устаюць храбрацы з узвода гвардыі сержанта Сцерлікава, якія пад моцным ружэйна-кулямётным і мінамётным агнём немцаu «упэунена, рэйс за рэйсам перапраўлялі людзей, боепрыпасы, гарматы на правы бераг ракі, сапёры гвардыі лейтэнанта Рыбалкіна, пабудаваўшыя, стоячы па пояс у вадзе, цяжкія плыты для пераправы дывізіінай артылерыі. Да артыкула гвардыі капітана Напрэева прыкладзена схема раёна пераправу, добра знаёмага кожнаму сапёру. У часопісе названы прозвішчы 60 байцоu і афіцэраu батальёна, узнагароджаных ордэнамі і медалямі за баі на Дняпры. Дняпроускай тэме прысвечаны і вершы афіцэра-сапёра Заўрыева:

Пришла желанная пора.
На правом берегу Днепра
Слышны раскаты
громовые
И крики мощные «ура»...

Часопіс гэты пісалі, рэдагавалі, афармлялі тыя, хто стойка змагауся у Крыме, адграваu сваім дыханнем чэкі у мінах пад Сталінградам, хто геройскі фарсіраваu Аку і Днепр. Менавіта гэта робіць кожны радок у часопісе такім значным, важкім. 1мя гвардыі малодшага сержанта Андрэя Каліstратава, напрыклад, у №№ 10—11 «Чырвонага сапёра» мы сустракаем тры разы. У артыкуле, прысвечаным фарсіраванню Дняпра, гаворыцца, што лодка Каліstратава у ліку першых накіравалася да правага берага. На сярэдзіне ракі яе разбіла снарадам. «Каліstратау, распрануушыся у ледзяной вадзе, уплаu накіроуваецца назад, пераапранаецца і накіроуваецца на правы бераг. Другі раз імя Андрэя Каліstратава мы сустракаем у спісе узнагароджаных ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Трэці раз ён упамінаецца у часопісе у якасці аутара вясёлых частушак:

Били фрицев
в Сталинграде,
Колотили на Оке...

1мя гвардыі капітана Круглова таксама сустракаецца тры разы.

Старонкі рукапіснага акопнага часопіса, з любоuю напісаныя і з густам аформленыя сапёрамі, дыхаюць бодрасцю і верай у перамогу, сведчаць аб сіле, жыццярадаснасці, унутранай прыгажосці савецкіх воінаu.

М. ЛЯСНОЎ.

(«Красная звезда», 23.12. 1943 г.).

ПЛЁН ТВОРЧЫХ ПОШУКАЎ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

цікавасць і імкненне студэнтаў да пастаяннага удасканалення сваіх тэарэтычных і спецыяльных ведаў. Гэта спаўчуча адбілася і на удзеле студэнтаў усіх факультэтаў у рэспубліканскіх і усесаюзных конкурсах.

На Рэспубліканскі конкурс па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечаны 50-годдзю прысвоення камсамолу імя У. І. Леніна, былі прадстаўлены 164 лепшыя работы. Больш за усіх падрыхтавалі работ на конкурс кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і навуковага камунізму.

Аргкамітэт рэспубліканскага конкурсу прысудзіў 29 работам I катэгорыю, 94 работам — II катэгорыю і 40 работам — III катэгорыю. 29 работ былі накіраваны на трэці, заключны этап V Усесаюзнага конкурсу па праблемах грамадскіх навук. Па выніках гэтага конкурсу Міністэрства і ЦК ВЛКСМ узнагародзілі дыпломам I ступені з прысваенне першай прэміі студэнтаў гістарычнага факультэта Ю. Глыбоускага (за работу «Фарміраванне дыялектыка - матэрыялістычнага метаду эканамічных даследаванняў у работах К. Маркса і Ф. Энгельса») і А. Гурыновіча (за работу «Новы этап у развіцці маладзёжнага руху у ЗША (1970—1973 гг.)» Дыпломамі III ступені з прысуджэннем трэцяй прэміі узнагароджаны студэнты гістарычнага факультэта В. Абрамава (за работу «У. І. Ленін і гуманістычная сутнасць Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі») і А. Дубовік (за работу «Асноўныя напрамкі ўзаемадзеяння сусветнай сістэмы сацыялізму на нацыянальна-вызваленчы рух»). Студэнты І. Аношка (фізфак), Г. Новік і І. Швец (ФПМ), В. Анціпонік, Л. Аборына, А. Каралькоў, П. Яхімовіч (гістфак) узнагароджаны граматамі Міністэрства і ЦК ВЛКСМ.

На Рэспубліканскім конкурсе па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках 1974 года кафедрамі і факультэтамі было адабрана і накіравана 663 работы. Усе факультэты прадставілі работ больш, чым у папярэднія гады, і больш за ніводзін — філалагічны (97 работ), фізічны (90), біялагічны (89).

На Усесаюзным конкурсе 1973-74 навучальнага года па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках БДУ быў прадстаўлен 34 работамі студэнтаў усіх факультэтаў, акрамя геаграфічнага факультэта і факультэта журналістыкі. Медалём «За лепшую навуковую студэнцкую работу» узнагароджана студэнтка юрфака Н. Ядзевіч (за работу «Падзел паю і кватэры у ЖСК») і студэнт ФПМ Чан Дык Ван (за работу «Аб адным класе задач спалучэння эліптычных сістэм»), а іх навуковыя кіраўнікі прафесар В. Ф. Чыгір і в. а. дацэнта В. І. Карзюк — дыпломамі Міністэрства і ЦК ВЛКСМ.

Студэнты В. Булатау, Т. Калюжная, Р. Навумовіч (ФПМ), С. Гілеускі (фізфак), Т. Злотнік і Д. Юнусава (біяфак) узнагароджаны дыпломамі Міністэрства і ЦК ВЛКСМ.

Члены студэнцкага навуковага таварыства прынялі удзел ва усесаюзнай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў у Новасібірскім універсітэце, у канферэнцыі, якая прахадзіла у Казані і падвяла вынікі V усесаюзнага конкурсу, у V канферэнцыі лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ ВНУ БССР у г. Магілёве, а таксама выступілі з дакладамі на вузаўскіх і міжвузаўскіх канферэнцыях у 40 універсітэтах і інстытутах Савецкага Саюза. Акрамя таго, студэнт гістарычнага факультэта В. Андруховіч выступіў з дакладам «Інтэрнацыянальныя сувязі ВНУ Беларусі» на міжнародным студэнцкім семінары у Бухарэсце «Студэнты і еўрапейская бяспека» у студзені 1974 года. 35 студэнтаў былі аутарамі або сааутарамі дакладаў, прадстаўленых на навуковыя канферэнцыі прафесарска - выкладчыцкага саставу.

З кожным годам усё больш студэнтаў становяцца аутарамі і сааутарамі работ, што апублікаваны у друку. Заслугоўвае ўвагі і распаўсюджання вопыт работы кафедр філалагічнага, фізічнага, хімічнага, біялагічнага факультэтаў, якія заахвочваюць студэнцкую творчасць і дапамагаюць у публікацыі выніку іх даследчай працы. Усяго у 1974 годзе 623 студэнты сталі аутарамі і сааутарамі работ, апублікаваных у друку.

За поспехі, дасягнутыя у арганізацыі і пастаноўцы навукова-даследчай работы студэнтаў, Ганаровым дыпломам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ узнагароджаны у 1974 годзе кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і кафедра мікрабіялогіі, а таксама савет студэнцкага навуковага таварыства універсітэта; 797 студэнтаў усіх факультэтаў дзённага, вячэрняга і завочнага навучання адзначаны рознымі узнагародамі.

Д. САКОВІЧ.

Лабараторыя малекулярнай фізікі. Сёння тут займаюцца першакурснікі.

НА ЗДЫМКАХ: дацэнт кафедры агульнай фізікі Вячаслаў Міхайлавіч Ткачэнка робіць разбор работы студэнта М. Бязручкі. Побач працуе Люда Бокач.

Фота С. ДЗЕЯНКОВА.

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

В. І. КАЧАЛАВА

ГАВАРЫЦЬ пра Качалава — гэта значыць гаварыць аб запаветным і дарагім Мастацкага тэатра і усёй рускай сцэны. Паўвекавое яго служэнне мастацтву — гэта слаўны шлях да вяршынь мастацтва.

В. І. Качалаў быў ужо вядомым акцёрам правінцыяльнай сцэны, калі у 1900 г. яго упершыню убачыла Масква у ролі Берэндэя. І у першым жа антракце аб ім загаварылі як аб цудоўным таленце. Пакарыла магутная сіла абаяльнасці артыста. У рэцэнзіях пісалі аб тым, як «праліліся у натоўп дзівосныя гукі цудоўнага, бліскучага расплаўленае срэбра голаса».

Качалаў заусёды быў любімым акцёрам рускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, якая бачыла ў ім смелага выразніка сваіх ідэалаў, мар і імкненняў. У яго Тузенбаху («Тры сястры» Чэхава) гледачы адчувалі веру у лепшую будучыню і ачышчальную буру, якая змяце з грамадства «ляноту, раўнадушнасць, прадузятасць да працы, гнілы сум». Любілі яго за малады і радасны заклік да новага жыцця Пеці Трафімава («Вішнёвы сад»), за непрымірымасць і высакароднасць яго Чацкага.

Мастацкія стварэнні Качалава заусёды сугучныя часу, што парадзіў іх. Таму былі такія зразумелыя і блізкія рускай інтэлігенцыі яго чэхаўскія вобразы, напоўненыя любоўю да чалавека, імкненнем убачыць і паказаць у ім прыгожае, чыстае, узняць чалавека над дробязямі буднаў.

Качалава цягнула да вобразаў магутных, духоўна супярэчлівых, татанічных: Шэкспіра, Ібсэна, Байрана, Пушкіна. Ён марыў стварыць гераічны вобраз барацьбіта за свабоду, за вяршэнне розуму, маральнай прыгажосці, праўды і справядлівасці, за свабодную чалавечую думку.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі па-новаму загучалі старыя вобразы, якія атрымалі новы сэнс. Мастак стаў больш цвёрдым, непрымірымым... Іграючы Захара Бардзіна, Гаева, ён адмовіўся ад спагадлівых адносін да сваіх герояў і лічыў, што іграе Бардзіна яшчэ больш бязлітасна, чым ён напісан Горкім.

У цудоўнейшым сваім стварэнні «Ад аутара» (у «Уваскрэсенні») Качалаў выступае адначасова і каментатарам, і мудрым крытыкам, і выкрывальнікам, і дэкламатарам. Ён гаворыць не толькі ад асобы, але і ад сэрца Талстога, раскрываючы і яго боль, і яго гнеў, і яго веру у чалавека.

Качалава называлі мыслщелем на сцэне. Яго Гамлет, Бранд, Іван Карамазаў, якія увасабляюць трагедыю думкі, не толькі цудоўныя па майстэрству выканання, яны глыбокія і арыгінальныя і па філасофскай задуме.

СЛАВА РУСКАГА ТЭАТРА

Творчасць Качалава выключна разнастайная. Аднолькава бліскуча ён іграў і пяшчотнага, лірычнага, летуценнага Тузенбаха, убачыўшы якога, Чэхаў сказаў: «Цудоўна іграе... цудоўна ж...». І ганарыстага, з жалезнай воляй Цэзара, Гамлета і басяка Барона, натхнёнага Бранда і бесклапотнага Пер Баста. Б. І. Качалаў адным з першых сярод старой гвардыі рускіх акцёраў стварыў вобраз савецкага чалавека — партызана Вяршынина у «Браняпоездзе-14-69» Ус. Іванова. У гэтай ролі ён прынёс на сцэну тэатра пафас рэвалюцыі.

Качалаў-чытальнік — гэта зусім асаблівая і выдатная з'ява у мастацтве. З канцэртнай эстрады словамі Талстога, Шэкспіра, Пушкіна, Маякоўскага, Багрыцкага, Блока ён гаворыць аб светлым ідэале чалавека, аб сіле жыцця, аб перамозе розуму і прыгажосці.

У мастацтве Качалава — гераічны дух рускай нацыі.

(Па артыкулу М. П. ХМЯЛЁВА, народнага артыста СССР).

ПРАКТЫКА — ЧАС АДКАЗНЫ

ПРАЦАВАЛІ З ЗАХАПЛЕННЕМ

Студзень — час сесіі і зімовых канікул. А вось для студэнтаў V курса гістарычнага факультэта — гэта месяц знаёмства з гісторыяй, але ужо не па падручніку, а па дакументальнаму матэрыялу. На цэлы месяц будучыя гісторыкі сталі супрацоўнікамі архівоў і музеяў сталіцы і іншых гарадоў рэспублікі.

...Цішыня стаіць у сховішчах архіва. Спачатку неяк губляешся сярод бясконцых паліц з дакументамі у папках. Дарэчы, такіх папэкспрау толькі у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР (ЦДГА) больш мільёна.

Гартаеш пажоўклыя старонкі і думаеш: «А раптам вось паміж гэтымі аркушамі чакае сустрэча з невядомым, невялічкае адкрыццё?».

— А ці бываюць зараз цікавыя знаходкі? — спыталі мы у старшага навукоўца супрацоўніка ЦДГА Т. А. Вараб'ёвай.

— А як жа. Вось, напрыклад, нядаўна знойдзена навуковая праца В. Р. Бялінскага, прысвечаная выкладанню рускай мовы у школах з нярускай мовай навучання. Гэта праца лічылася загінуўшай. Не страціла яна свайго значэння і зараз.

Шмат цікавага і карыснага даведаліся студэнты-гісторыкі у час практыкі: навучыліся апрацоўваць архіўныя матэрыялы, складаць навуковыя пашпарты да музейных экспанатаў, пазнаёміліся з патрабаваннямі да музейнай экспазіцыі. Захапляючым было падарожжа па фондах Дзяржаўнага музея БССР, дзе знаходзіцца каля 200 тысяч рэчаў, з якіх толькі сотая частка экспанавана у залах. А хутка музей павінен папоўніцца яшчэ адным незвычайным экспанатам. Лётчык - касманаут Пётр Клімук паабяцаў падарыць музею касцюм, у якім ён працаваў у космасе.

Чакалі нас і цікавыя сустрэчы з беларускім пісьменнікам Макарам Паслядовічам, з В. І. Лузгіным, які у час Вялікай Айчыннай вайны быў сакратаром Віцебскага падпольнага абкома камсамола.

Людзі, захопленыя, улюбёныя у сваю справу, знаёмілі практыкантаў са сваёй працай, перадавалі ім свае веды. Хочацца асабліва падзякаваць Р. А. Чарнаглазавай, старшаму навуковаму супрацоўніку Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Т. А. Вараб'ёвай, старшаму навуковаму супрацоўніку ЦДГА, Г. К. Юхновіч, старшаму навуковаму супрацоўніку Дзяржаўнага музея БССР.

Сур'ёзна аднесліся студэнты да практыкі і усе яны атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі.

У. АРЛОЎ,
студэнт V курса гістарычнага факультэта.

СПОРТ СПОРТ

ЗА СНАЙПЕРСКІ СТРЭЛ

У цыры БДУ панавала спартыўная атмасфера. Тут праходзілі спаборніцтвы па кулявой стральбе з дробнакалібернай вінтоўкі на асабіста-камандное першынство сярод супрацоўнікаў кафедр біялагічнага факультэта, прысвечаныя 30-годдзю Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй. Усе кафедры выставілі свае каманды у саставе пяці удзельнікаў.

Спаборніцтвы праходзілі з вялікім пад'ёмам і высокай актыўнасцю. У кожнага было жаданне прынесці сваёй камандзе пабольш залікових ачкоў.

І у выніку лепш за усіх у асабістым заліку сярод мужчын выступіў загадчык сектара мікрабіялогіі лабараторыі эксперыментальнай біялогіі А. Ф. Былінскі. Ён выканаў разрадны нарматыў і заняў першае месца. Другое і трэцяе месцы размеркаваліся адпаведна паміж асістэнтам кафедры мікрабіялогіі А. М. Сяльскім і лабарантам кафедры заалогіі І. Л. Паповым.

Трапна правялі стральбу і жанчыны. На першае месца выйшла старшы лабарант кафедры біяхіміі Н. М. Арол. Другі вынік паказала дацэнт кафедры фізіялогіі жывёл А. Г. Сташонак. Трэцяй была лабарант кафедры генетыкі В. Ф. Беланоуская. Нямнога не хапіла прызёрам, каб выканаць нарматыу трэцяга спартыунага разраду.

У канчатковым выніку поспех спадарожнічаў супрацоўнікам кафедры біяхіміі, кафедры генетыкі і лабараторыі эксперыментальнай біялогіі (сектар мікрабіялогіі), якія занялі адпаведна I, II і III месцы.

Галоўны суддзя спаборніцтвау, асістэнт кафедры генетыкі М. С. Марозік сказаў, што барацьба за снайперскі стрэл працягнецца паміж камандамі кафедр іншых факультэтаў. А затым на першынстве універсітэта у гонар 30-годдзя Вялікай Перамогі будуць спаборнічаць лепшыя з лепшых.

П. МІТРАХОВІЧ.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2 000 экз.
Аб'ём — 1 друк. ар. Заказ № 322. АТ 07111

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.